Беларускі Звон

ТЫДНЁВАЯ ЧАСОПІСЬ.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 33. Рэдакцыя адчынена: 12—1 штодня апрача сьвяточных дзён.	Рукапісы павінны быць напісаны чытальна і толькі на адным баку паперы, з праўдзівым прозьвішчам аўтора і адрэсам (для ведама Рэдакцыі). Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана кожнага нумару 10 м. Падпіска на 3 месяцы каштуе 150 м. (з даст. да хаты). Цана абвестак: 50 м. за радок пэтыту (на апошн. стр.).

Год I. Вільня. Пятніца, 26 жніуня 1921 г. № 9.

Пільная справа.

На ўвесь сьвет чуваць аб тым вялікім няшчасьці, якое ўтварылася каля берагоў Волгі, на далёкім усходзе Маскоўшчыны. Голад, які зьявіўся рэзультатам шмат якіх ненормальнасьцяў нашага часу, ахапіў мільёны людзей і выганяе іх з родных, але галодных, сяліб далей на ўсход у Сыбір і на Захад, у наш бок.

Ня трэба запамінаць, што сярод мільёнаў галодных расейцаў і іншых надвалжанскіх народнасьцяў Расеі ня мала ёсьць і нашых няшчасных выгнанцаў беларусаў-уцекачоў.

Ратуючыся ад нямінучае галоднае сьмерці на чужыне, ўцекачы гэтыя напэўна скіруюцца сюды на захад, у свой родны бок, адкуль іх выгнала бязьлітасная вайна, кінуўшы ў нячуванае гора, ў жабрацтва.

Шэсьць гадоў таму назад увосень 1915 году ня менш як паўтара мільёна беларусаў—жыхароў Віленшчыны й Горадзеншчыны мусялі кінуць свае родныя хаты, з якіх выганялі іх бізуны царска-расейскага ўраду.

Жудасна ўспомніць той нявольны рух нашых сялянскіх масаў на ўсход.

Яшчэ жудасьней робіцца, калі падумаем аб тым, як і пры якіх варунках, хоць частка яшчэ нязгінуўшых ад нядолі, перасяляецца цяпер назад, на свае попелішчы.

Так, на попелішчы. Бо іншага нічога не магла зрабіць дзікая вайна на месцы нядаўняга спакойнага бытаваньня нашага сялянскага народу.

Калі ўзяць пад увагу тое, што [illegible]зка ўжо й восень—халодная пара году, дык трагічнае палажэньне [illegible]асных уцекачоў стане зусім [illegible]м, каб яны навет і змаглі, праз вельмі хуткі час, вярнуцца да сваіх пустых хатаў, а яшчэ часьцей да голых попелішчаў.

Дасюль усё складалася так, што ня было магчымасьці вярнуцца дадому закінутым лёсам у самыя далёкія куткі Маскоўшчыны беларусам-уцекачом.

Цяпер голад, які скрануў з месца й самых надвалжанскіх маскалёў, стыхійна папрэ на захад тых беларусаў, якія яшчэ жывы засталіся праз доўгія шэсьць гадоў выгнанства.

Гэтага трэба чакаць і стаць перад фактам нязвычайнага наплыву ўцекачоў трэба падгатаваўшыся.

Калі голад з чумою й халераю пачаў касіць мільёны людзей у ажабрачанай Расеі, дык цэлы сьвет загаварыў аб самай хуткай дапамозе няшчасным, забываючы ўсе палітычныя перашкоды да гэтага.

Калі трэба асяліць на родных мясцох тых, якія павінны вярнуцца, ўцекачоў, дык ці-ж ня можна было-б, у імя ўшанаваньня іх чалавечага права, адмовіцца ад розных фармальнасьцяў.

Тыя, хто фактычна пануе на бацькаўшчыне няшчасных уцекачоў, павінны парупіцца аб самым найхутчэйшым іх павароце дадому і аб магчымасьці істнаваньня іх, у першыя часы, тут на месцы. А „Беларускае Таварыства дапамогі ахвярам вайны“, аб якім нешта нічога ня чуваць за ўсё лета, павінна, нарэшце, падумаць аб тым, што мала напісаць і абвясьціць „зацьверджаны“ статут, а й сапраўды ўлажыць, які магчыма, рэальны зьмест у свае шырокія замеры.

Дмух-Обст-Мураўёвы.

Віленскай вокладцы „Жэчыпаспалітай“ што далей, то балей ня сьпіцца ад беларушчыны, бо рэдка калі бывае дзень, каб беларускім справам не пасьвяціў артыкульчыка які-небудзь I. Обст, або Павал Дмуха et tutti quanti. Відаць, дадзелі мы моцна гэтым тыповым прадстаўніком сярэдніх вякоў заходня-эўрапэйскай культуры. Што-ж паробіш? Не падабаемся мы, мусіць, адным навет тым, што жывем, што мы ёсьць і будзем жыць, хоць-бы можа і хацелася розным там..... выбачайце, Дмух-Обстам нас зьесьці, як хацеў зьесьці ягня воўк за тое, што яно жыве.

Найбольш непакоіць гэную сярэднявечную дзіч быстрае разьвіцьцё беларускай сьвядомасьці, як палітычнай, так і культурнай, асабліва-ж—разьвіцьцё беларускай школы. I вось паны Дмух-Обсты давай крычэць, на ўсю моц, і лаяцца на ўсю сілу.

Паслухайце толькі, што піша П. Дмуха аб беларускай школьнай справе (№ 185 Rzp.). „Ці і каму патрэбна ў нас (у сярэдняй Ліцьве ці ў Польшчы? Рэд.) беларуская школа?“

„Беларускае школьніцтва ў даны момэнт ёсьць консэнс, а сваею мэтаю мае пропаганду русіцызму і г. д.“.

„У школах навет элемэнтарных беларускіх ня могуць абыйсьціся бяз чужой помачы“.

„Аб сярэдняй школе мовы быць ня можа“.

„Школ беларускіх у сучасны момэнт маем столькі, што на кожнае беларускае дзіця прыходзіцца адна школа“.

„На самым дзеле школы гэныя лічаць больш вучняў, але там ёсьць жыды, рускія і навет значная частка польскіх дзяцей“.

Такога зданьня п. Дмуха аб беларускай школе. Ну, а раз школа дрэнь, то дрэнь і падручнікі школьныя.

„Школьных беларускіх падручнікаў, па першае, не хапае, а потым з погляду пэдагогічна-дыдактычнага яны не адпавядаюць свайму назначэньню“.

„Даказаўшы“ што ні школы ні падручнікаў беларусы ня маюць, п. Дмуха «сцьвярджае», што лічба «усьведамленых» беларусаў „не перавышае некалькіх сот і ў адносінах да агульнай лічбы народу нашага краю складае нязначную меншасьць“.

А калі так, то трэба запытацца ў спэцыялістаў, ці беларуская мова можа быць моваю выкладовою, ці істнуючыя падручнікі падходзяць для школ і агулам ці беларускае школьніцтва ёсьць магчымым і карысным для краю“, а покуль гэтага ня будзе зроблена, то грамядзянства (паны I. Обст і Дмуха? Рэд.) будзе глядзець на цэлую работу беларускую, як на палітычнае круцельства“.

I Дмуха мае надзею, што спэцыялісты установяць тое, што устанавіў ужо п. Дмуха, і, знача, школы беларускай ня будзе. Тады толькі паны Дмухі заспакояцца. Замест беларускіх яны адчыняць школы... якія? Не расейскія-ж, ня літоўскія, ня жыдоўскія, не нямецкія, а разумеецца—польскія. Аб тым толькі і ходзіць Дмух-Обстам цяпер. Але калі-б, скажам, у нас панаваў цяпер Мураўёў, родны брат іх—не па нацыянальнасьці, а па культурна-палітычных праканаваньнях, ці напісалі-б яны тое, што мы прывялі вышэй.—Думаецца, што не, бо немагчыма, каб знайшоўся цяпер ня толькі сярод палякоў, а і наагул сярод людзей такі, хто-б стаў падтрымліваць мураўёўшчыну, хто-б апрача пануючай палітыкі і культуры нічога «інародчаскага» не прызнаваў.

Уся розьніца паміж палітыкай Мураўёва і палітыкай Дмух-Обстаў толькі ў тым, што першы вешаў і душыў звычайнай грубай вяроўкай, тады як другія «мягка душаць», вяроўкою з ватнаю падсьцілкаю, прыгаварваючы прыгожыя слоўцы аб культуры, ў імя якой усё павінна згінуць, апрача сьвятой інквізыцыі Дмух-Обстаў.

Нас проста бярэ абрыда, выпадае пяро з рук, пішучы ў адказ на сьвядомую фальш, якую сыстэматычна аб нас разносяць паны I. О. і Дмухі. Мы-б не хацелі з імі мець ніякога дачыненьня. Але, ад сыстэматычнага лгарства, ўсім яснага, калі перастаць на яго рэагаваць, нешта застаецца, як мута. Толькі таму мы і рэагуем на пісаніну Дмух-Обстаў.

Так вось, хай будзе ведама ўсякаму, што школа беларуская мо' толькі гадоў 4 таму назад, як зьявілася на сьвет Божы. Раней гэтага—пры царскім рэжыме—беларускай школы па розных мотывах, узноўленых цяпер Дмух-Обстамі, не дапушчалі зусім. Якім-жа цудам можа яна быць з усіх бакоў добраю? Ясна, што ў ёй тое-сёе не ў парадку, але гэта з часам зьнікне. А гдзе гэтага няма? Можа ў польскай школе? Пачытайце хоць-бы тую самую «Жэчпаспалітую» Варшаўскага выданьня. Або спаткайцеся з граматным селянінам, дзе ёсьць польская школка. Спытайцеся, як, хто і што вучыць у польскіх вясковых школках. I ў варшаўскай «Жэчы» і ў селяніна Вы знойдзеце адзін адказ, які не здаволіць Дмух-Обстаў. Дык што-ж? Можа спыніць і польскую школу і адчыніць іншую,—можа расейскую, можа яна пойдзе ляпей, як польская? Як Вы думаеце, паны Дмуха і Обст?

Усю сваю нягодную пісаніну аб нас п. Дмуха прыкрывае гэткімі агульна—філёзофскімі „аксыомамі»:

«Здавалася-б натуральнай рэччу, каб кожны народ меў школу ў роднай мове. Да таго, аднак, патрэбна быць народам, а потым уладаць моваю, здольнаю быць арудзьдзем прасьветы. Ў Рымскай імпэрыі, аж да часаў Цыцэрона вышэйшыя школы карысталіся грэцкаю моваю, а цэлыя сярэднія вякі не даліся адлацініцца».

Што больш, як дванадцаць-мільённы беларускі народ для пана Дмухі ня ёсьць народ і што на сваёй роднай мове ён ня можа вучыцца, мы ўжо ведаем. Што п. Дмуха і нябожчык Мураўёў зышліся ў гэным пункце аб нас—ня дзіва. Нам гэта вельмі падабаецца. «Истинно-русскій» і «zupełnie-polski» погляды на нас,—бяз нас. Але што кажам мы, што кажа наш народ? Што сказаў-бы ён пры варунках права і справядлівасьці, не гаворачы аб варунках незалежнасьці ад каго-б там ні было.

Нам здаецца, што ён «здмухнуў»-бы пана Дмуху et cetera і на тым быў-бы канец усім гэтым, нічога не даказваючым, экскурсіям у сярэдне-вяковую лаціншчыну і ў рымскую грэччыну.

Як асьляпляюча ні сьвяціла культура грэцкая, а потым лацінская сярод дзікіх народаў даўнасьці, але ні эльлінізм ні романізм,—у самым шырокім значаньні гэтых слоў,—не змаглі задушыць ні сваею духоўнаю сілаю, ні фізычнаю, гэтых дзікіх народаў з іх слабымі ў той час культурамі і мовамі. А вам хіба ня ведама, п. Дмуха, што сярэдня-вечная лаціна, апрануўшаяся ў схолястычна-касьцельную вопратку, выклікала ўзрыў «гуманізму», «адраджэньня» і потым навет рэлігійных рэвалюцыяў?

Ну, дык душэце нас, зачыняйце нашыя школы, каб ніводнай не засталося. Вымятайце чысьценька беларушчыну і калі ня вы, дык вашыя і нашыя дзеткі увідзяць, якія з усяго гэтага будуць рэзультаты.

Іх вам ня ўдасца «задмухаць».

Плюха.

Праўда і палітыка.

Ёсьць людзі, якія ніяк ня могуць проста глядзець на рэчы, але ўсё мусяць бачыць адбітым у крывым люстры сваей палітыкі. Дасканальным прыкладам гэтага можа служыць справа „celi Konrada“.

Рэч у тым, што ў Базыліянскіх мурох, дзе цяпер месьціцца Беларуская Гімназія, пакутаваў у вастрозе разам з сваімі таварышамі вялікі сын і пясьняр нашае зямлі, польскі поэт Адам Міцкевіч. У гэтых самых мурох адбываюцца па-

дзеі і яго найбольш натхнёнага твору — III часьці „Дзядоў“. У вадной з цэляў кляштару фантазія поэта памяшчае гэроя названага твору „Konrada“. У гэтай самай цэлі адбываецца ведамая імпровізацыя Конрада — найвышэйшая верхавіна промэтэйскай песьні... Месца гэта дарагое ня толькі для паляка, але й для кожнага культурнага чалавека павінна быць такім. Тым больш для нас беларусаў: ня зьбіраемся мы ані адбіраць ад палякоў Міцкевіча, ані думаем выракацца таго, што ён кроў з крыві і косьць з касьці нашай—ён для нас вялікі польскі поэт, родам беларус, ён для нас, перад усім, вялікі чалавек.

Імя яго ніхто з нас ніколі ня ўжываў, ня ўжывае і багдай ніколі ня ўжыве дзеля злоснай палемікі, тым больш дзеля дапяцьця якіх нячыстых мэтаў. Але,—аж нам сорамна тутака казаць,—гэта робяць з заўзятасьцю, вартай лепшае справы, некаторыя „вядомыя“ ў Вільні польскія дзеячы, а навет прадстаўнікі польскай навукі.

Пан Студніцкі на падставе нейкіх імглістых домыслаў прышоў да «пераконаньня» (ці ў пераконаньні толькі рэч ?!), што цэля Конрада месьціцца там, дзе цяпер... патрэбная каморка. За ім усьлед пацягнуўся і проф. Пігонь, выпусьціўшы навет цэлую брошурку ў гэтай справе. Пасьля раду зьбіваючых адзін аднаго аргумэнтаў ён адважыўся сказаць, што цэля Конрада напэуна устаноўлена і што гэта ёсьць... тая самая няшчасная каморка. Больш таго — ён на падставе сваей вучонай (і... об'ектыўнай?) інтуіцыі цьвердзіць, што маскалі сумысьля гэтую (дадуманую) цэлю Конрада абвярнулі на неадпаведны ўжытак. Добра—маскалі, дапусьцім сабе, зрабілі такую нягодную рэч, але пры чым тут беларусы, што яны вінаваты, што проф. Пігонь толькі сёлета „напэўна“ зрабіў сваё адкрыцьце?... то-ж да гэтага часу хіба ніхто напэўна гэтага ня ведаў. Што там —на тое яны і беларусы, каб да іх прычапіцца. Ідэйны прыяцель Пігоня і Студніцкага п. Perzyński з «Rzeczpospolita»й — дык той проста напісаў што... беларусы перарабілі цэлю Конрада на каморку. Разумеецца, не абыйшлося тутака бяз жыдоў, бо й яны ходзяць у беларускую гімназію і... ў каморку (водле ведамага польскага прыслоўя: Jak na Litwie tak na Rusi . . . . każdy musi).

Калі п. Студніцкі — архіварыус (хіба-ж не архіварыят?) места Вільні, калі п. Пігонь, паважны вучоны, калі іх запраўды абходзіць толькі праўда, а не нацыянальная грызьня, калі ім запраўды дарага памяць Міцкевіча (а ён думаў аб брацтве народаў), то чаму яны, шукаючы цэлі Конрада, не ўзяліся за гэтую справу спакойна, паважна і разважна?

Чаму не стварылі камісіі з будаўнічых і іншых патрэбных спэцыялістаў, каб агледзіць муры, дзе, што, калі будавана і як усё гэта вяжацца з літэратурнымі данымі. Нельга пазбыцца няпрыемнага ўражаньня, што проф. Пігонь проста пагнаўся за таннай рэклямай сярод віленскіх „патрыятычных“ кругоў: столькі гадоў паганілі памяць вялікага поэта, не знайшлося абаронцы, а вось ён—прышоў, пабачыў і знайшоў... Выходзіць так, што проф. Пігонь, напісаўшы недаварапую брошурку, плюнуў на маскалёў, беларусаў, жыдоў і на... памяць (але лепш ня будзем ужываць яго імя).

Тымчасам, нягледзячы на зьнявагі і пашырэньне нягоднай брахні, Беларускае Навуковае Таварыства ў Вільні ўзялося за справу дужа спакойна і разважна з адзінай мэтай устанавіць праўдзівую цэлю Конрада. Уважаючы, што й дагадка (толькі дагадка!) п. п. Пігоня і Студніцкага можа часам мець пад сабою нейкі грунт, яно да часу выясьненьня справы распарадзілася названую каморку ачысьціць і зачыніць. Агульны сход Таварыства 22 чэрвеня г. г. даручыў грамадзяніну Б. Тарашкевічу склікаць дзеля гэтае справы камісію з прадстаўнікоў адпаведных польскіх і беларускіх установаў. Грамадзянін Б. Тарашкевіч зьвярнуўся з гэтым да Дэпартамэнту Асьветы і прадстаўнік апошняе установы П. Верут-Кавальскі склікаў на 16 г. м. камісію з такіх асоб: дзекан Ф. Рушчыц, д-р Загорскі, інжынер Пегуткоўскі, п. Студніцкі, архітэктары—проф. Клос, С. Вазьніцкі, Даўкша і п. Верут-Кавальскі (з польскага боку); інжынер А. Трэпка, п. Антон Луцкевіч і Б. Тарашкевіч (ад Беларуск. Навуковага Таварыства). Камісія сабралася ў поўным складзе ў Базыльянскіх мурох і адразу-ж прыступіла да агледзін іх раскладу. Выясьніла зусім пэўна, што памянёная каморка месьціцца ў пазьнейшай прыбудоўцы, якую, судзячы з віду і разьмераў, найскарэй што займалі сходы. Цяпер ідуць яшчэ працы дзеля абсьледаваньня муроў. Ня будзем-жа забягаць наперад з сваімі яшчэ ня зусім праверанымі вывадамі; скажам толькі адно: усе сябры камісіі мелі такое ўражаньне, што няма ніякой пэўнасьці, каб у названым месцы магла быць „цэля Конрада“; наадварот, больш даных за тое, што гэтую цэлю трэба шукаць далей на адзін пакой, там дзе канчаецца аснаўны будынак, аддзяляючыся ад прыбудоўкі капітальнай сьцяною. Навет сам п. Студніцкі страціў сваю пэўнасьць. Вельмі шкада, што ў камісіі ня было проф. Пігоня. Хіба-ж яму сорамна было-б за сваю лёгкамыснасьць і несправядлівыя нападкі?

Бедны профэсар, так марна прападае ўся ваша рэкляма!

Т. Навіна.

Беларускі Камітэт помачы ў Бэрліне.

Сярод мясцовай беларускай коленіі паўстала думка аб арганізацыі Камітэту помачы галадаючым у Беларусі й на Паволжжы.

У суботу 20 жніўня а 7 г. ўвечары ў памяшканьні Беларускай Місіі (Motz str. 21) адбылося пасяджэньне ініцыятыўнае групы, ў якую ўходзяць ураджэнцы Беларусі бяз розьніцы нацыянальнасьці і партыйнай прыналежнасьці.

Беларусь на конгрэсе прыгнечаных нацыянальнасьцяў.

1-га верасьня адчыніцца ў Жэнэве конгрэс прадстаўнікоў прыгнечаных нацыянальнасьцяў, які склікаецца арганізацыяй абароны правоў народаў.

Конгрэс гэты будзе засядаць адначасна з пленумам Лігі Нацыяў. На ім будуць прадстаўлены толькі тыя народнасьці, дзяржаўнасьць якіх яшчэ ня прызнана вялікімі дзяржавамі, як напр.: Эгіпэт, Ірляндыя і інш., а так сама й народы быўшае Расеі.

На конфэрэнцыю мае быць выслана і беларуская дэлегацыя.

Беларуская нацыянальна-палітычная конфэрэнцыя ў Празе.

З мэтаю коордынацыі ўсіх беларускіх нацыянальна-палітычных сіл і групаў, якія працуюць у справе адраджэньня Бацькаўшчыны, Рада Беларускай Нацыянальнай Сувязі склікае ў Празе-Чэскай на 25 верасьня г.г. нацыянальна-палітычную конфэрэнцыю, якая займецца справамі ўнутранага і замежнага палажэньня Беларусі.

Рада Беларускай Нацыянальнай Сувязі зьвярнулася да ўсіх беларускіх і жыдоўскіх арганізацыяў, як на месцы, так і заграніцай, асабліва да беларускіх зямлячастваў і партыяў у Амэрыцы з прапазыцыяй дэлегаваць на конфэрэнцыю сваіх прадстаўнікоў. (Бел. прэсбюро).

Беларускі краўцоўскі коопэратыў у Амэрыцы.

У Броневіле з'арганізаваўся коопэратыў краўцоў-выхадцаў з Меншчыны. Майстэрня мае 30 машын, пры якіх, працуюць 40 чалавек. Шыюць мужчынскія каптаны. Кожны дзень шыецца па 2000 і болей каптаноў. (Бел. прэсбюро ў Амэрыцы).

Палітычная хроніка.

Пятніца, 19 *жніўня*.

Вярхоўная Рада выслала ноту да польскага Ураду ў справе Верхняе Сьлезіі. У ноце, паміж іншым, гаворыцца, што Вярхоўная Рада адлажыла рашэньне аб граніцах паміж Польшчай і Нямеччынай, але нішто ня будзе закінена, каб гэты адклад быў найкарацейшым. Вярхоўная Рада лічыць, што польскі ўрад, з свайго баку, закліча польскае насяленьне да поўнага спакою і аднačасна ўжыве ўвесь свой уплыў на насяленьне Верхняй Сьлезіі ў кірунку пашаны да Міжсаюзнае Камісіі. Польскаму Ураду зьвяртаецца асаблівая ўвага на тую паважную адпавядальнасьць, якую меў-бы гэты ўрад, калі-б не захацеў ужыць на сваёй тэрыторыі а, паміж іншым, на граніцы Вархняе Сьлезіі, спосабаў спыненьня ўсялякае пробы неспакойства на плебісцытным абшары.

— Лёйд-Джордж зрабіў заяву ў Парлямэнце аб справе перадачы ў Раду Лігі Народаў в.-сьлезкага пытаньня. У заяве, паміж іншым, сказана, што рашэньні саюзьнікаў расходзяцца па пытаньню аб прамысловым абшары, на якім большасьць галасоў выпала на долю Нямеччыны. Французы прапануюць прызнаць капальні за Польшчаю. Лёйд-Джордж не згаджаецца з паглядамі французаў. Сьлезія ня ёсьць польскаю провінцыяй. Ангельская энцыклёпэдыя гэта пацьвярджае. Францыя адкінула прапазыцыі іншых саюзьнікаў, праз гэта справа перадаецца ў Лігу Народаў.

— У Белградзе памёр кароль Югаславіі—Пётра.

— Паводлуг вестак з Канстантынопалю, грэкі перарвалі турэцкі фронт.

— У канцы тыдня мае адбыцца конфэрэнцыя польскага пасла ў Маскве Піліповіча з Чычэрыным аб справах агульных, а так сама й бягучых.

— З Масквы паведамляюць, што паміж украінскім савецкім урадам і Турцыяй ідуць перагаворы аб заключэньні трактату.

Субота, 20 *жніўня*.

У бэрлінскіх прамысловых колах з пэўнасьцю гавораць, нібыто ў справе Верхняй Сьлезіі ёсьць ужо

Францішк Аляхновіч.

НЯСКОНЧАНАЯ ДРАМА

пьеса ў 4-х актах.

(Гл. № 8).

КОСТУСЬ. Я бачу адно: задоўга я ў цябе жыву, дадзелі мы адзін аднаму. Паміж прыяцелямі тады дружба крапчэе, калі яны рэдка бачаць адзін аднаго. Калі мы хочам далей заставацца прыяцелямі, дык мы павінны рэдка бачыцца, гадуючы ў душах толькі ўспамін нашых супольна пэражытых дзіцячых гадоў.

ВАСІЛЬ. Растацца можам хоць сягоньня. Я цябе тут жыць не прымушаю.

КОСТУСЬ. Ты хочаш сказаць, што ляпей было-б, каб я выехаў з тваей кватэры?

ВАСІЛЬ. Вось—тое я й кажу.

КОСТУСЬ. Ну—добра! Няма ніякіх перашкодаў. Трэба толькі разрахавацца. Колькі я табе павінен заплаціць?

ВАСІЛЬ. Ты жартуеш! Гэта-ж я табе вінаваты!

КОСТУСЬ. Я ня ведаю... Я нічога не рахаваў... Як скажаш, так і добра.

ВАСІЛЬ. Ага! Разумею! Ты ведаеш, што я заматаўся ў гэтым даўгу, як у сецях, — ты зумысьля мне гвалтам піхаў грошы, каб цяпер вось сваім велікадушным жэстам стаптаць мяне ўшчэнт... Не, не. Кажы, колькі табе ад мяне належыцца?

КОСТУСЬ. Ах, Божа мой!... Дык-жа я кажу, што ня ведаю.

ВАСІЛЬ. Ня ведаеш? Ну, дык пастарайся прыпомніць і скажы мне. Я да заўтра заплачу табе ўсё — кожную капейку.

КОСТУСЬ. Можаш гэтак не сьпяшацца.

ВАСІЛЬ. Не! пасьля гэтай гутаркі я нічым не хачу быць табе абавязаны.

КОСТУСЬ. Хэ! ня першая гэта такая ў нас гутарка...

ВАСІЛЬ. Але апошняя!

КОСТУСЬ. Бог дасьць мо' й не апошняя.

ВАСІЛЬ. Я маю надзею, што мы ўжо растаемся.

КОСТУСЬ. Але. Гэта канешна патрэбна.

ВАСІЛЬ. І я так думаю.

КОСТУСЬ (глядзіць іронічна на Васіля). Хэ-хэ-хэ! Ну, значыцца дакучаць тут табе больш ня буду. Іду складаваць свае рэчы...

ВАСІЛЬ. І абрахуй, калі ласка, колькі я табе вінаваты?

КОСТУСЬ. (выходзячы). Добра... добра...

Зьява 7.

ВАСІЛЬ (адзін).

ВАСІЛЬ. О, Божа мой, Скуль узяць грошы, каб аддаць яму?! О, Божа мой, галава трашчыць. Скуль узяць?!...

Зьява 8.

ВАСІЛЬ і ЯДЗЬКА (ўваходзіць).

ЯДЗЬКА. Ну, я ўжо ўсё устроіла. Заўтра можна будзе аддаць дзіця ў прытулак. Там вельмі добра..

ВАСІЛЬ. Ведаеш, я толькі што пасварыўся Костусем...

ЯДЗЬКА. Ну, гэта не пяршыня!

ВАСІЛЬ. Трэба канешна аддаць яму ўсё, [illegible] мы вінаваты! О, Божа мой! скуль узяць?!

ЯДЗЬКА. А адкуль-жа ж мы возьмем гэ[illegible] грошай!.. Колькі гэта будзе?

ВАСІЛЬ. Я сам добра ня ведаю. Шмат!

ЯДЗЬКА. Э, ня дуры галавы! Гэтулькі разоў ты ўжо сварыўся з ім і пасьля была ізноў згода. Гэтак сама будзе і цяпер.

ВАСІЛЬ. Не, цяпер зусім што іншае цяпер інакшая справа. Я не магу болей з ім жыць. Ён ядам сваім атручвае маю душу, ён адбірае ад мяне маю веру—я даўжэй не магу!...

ЯДЗЬКА. Якую веру?

ВАСІЛЬ (глянуўшы на яе пальто). Ах, Ядзечка! Ведаеш што? Толькі ты, калі ласка, ня гнявайся на мяне... Трэба яму аддаць усё, ўсё да капейкі!... У мяне ёсьць добры проект... Толькі ты, Ядзенька, ня гневайся...

ЯДЗЬКА. Ну што? Кажы!

ВАСІЛЬ. Я прадам тваё пальто. За яго многа дадуць. Я яму кіну ў твар усе грошы, я не хачу быць у матар'яльнай ад яго залежнасьці...

ЯДЗЬКА. Што?! Прадаць пальто?! О, выбачай! Дудкі! Хочаш мусі, каб я йзноў хадзіла абарваная, як жабрачка. Не, гэтага ніколі ня будзе! Паўлінка мне дала пальто і я табе яго не аддам, каб ты ня ведаю што!... Э, разумны які!—На службу, якую яму людзі

рашэньне, якім прызнаецца за Нямеччынай цэлы прамысловы абшар.

— Чычэрын пагражае вайною Румыніі за тое, што яна нібыто падтрымоўвае на сваёй тэрыторыі азбройваньне войскаў Пятлюры, замерваючыся заняць разам з гэтымі войскамі Камянец-Падольскі і Магілёў.

— Дзеля таго, што, дзякуючы спэкуляцыі, ў Польшчы моцна расьце дарагоўля,—Рада Міністраў даручыла міністрам: харчаваньня, ўнутраных справаў і справядлівасьці апрацаваць проект распараджэньняў аб барацьбе з дарагоўляю.

— Ад 1 да 8 жніўня ў Канстантынопалі зарэестравана 17 выпадкаў халеры. У Галаце (часьць Канстантынопалю) было два выпадкі чумы. Камісары вялікіх дзяржаваў устанавілі строгі карантын для прыяжджаючых караблёў.

— Конфэрэнцыя Брауна з Ліцьвінавым зацягваецца. Браун хоча поўнае свабоды ў назначаньні сяброў і выбары месцаў пад склады харчовых пунктаў, дакляруючы карміць мілён дзяцей. Ліцьвінаў жадае савецкага кантролю і харчаваньня 12 мільёнаў дзяцей.

— Савецкае пасольства ў Варшаве паведаміла Мініст. заграінічных справаў, што ў нядзелю 14 жніўня каля палудня на першы паверх Рымскага отэлю, дзе месьціцца савецкае пасольства, зайшлі тры незнаёмыя цывільныя асобы, якія пачалі крычаць: „Дайце нам сюды гэтага Карахана“, дадаючы да гэтага некалькі абразьлівых словаў. Незнаёмыя, гаварыўшыя парасейску, былі выправаджаны з отэлю пэрсоналем пасольства. Аднаго з незнаёмых вураднікі пасольства затрымалі для выясьненьня прозьвішча. У працягу ўсяго гэтага зьявіўся новы незнаёмы, які назваўся прадстаўніком Грузіі, патрэбаваў выданьня „арыштованага“ і заявіў, што назаўтра прышле ў пасольства свайго сэкунданта, порт‘ера.

— Маскоўскія „Известия“ зьмяшчаюць трывожныя ведамасьці, нібыто ўзятыя з францускай прэсы, аб азбройваньні Польшчы. Нібыто ў францускай фабрыцы „Варко“ зроблена для Польшчы і Румыніі 87 гарматаў калібру 155 мілімэтраў, 60 гарматаў калібру 75, горныя гарматы калібру 65. Затым фабрыка Шнэйдэр выробляе для Польшчы гарматы, стрэльбы і патронташы (набойнікі). Фабрыка „Літон“ вырабіла значны лік калючага дроту, ўжо высланага ў Польшчу.

„Polpres“ заяўляе, што пагаласкі гэтыя саўсім фальшывыя.

— Францыя мае надзею, што пры разглядзе пытаньня аб В. Сьлезіі, яе прапазыцыі возьмуць верх, бо на старане сваёй лічыць Бэльгію, Данію, Бразылію і Кітай. Але калі гэтае пытаньне будзе разьбірацца пленумам, то тагды большасьць будзе за Англіяй, Праз увесь гэты час ідуць падгатаваўчыя паседжаньні, якія павінны палегчыць апошняе вырашэньне справы В. Сьлезіі.

— Маршалак Жофр 2 жніўня выехаў з Марсэлі параходам у Злучаныя Штаты, а адтуль паедзе у Японію; ен павінен вырашыць нёйкія важныя дыплёматычныя справы.

— Новы сэрбскі кароль Аляксандар, які займе трон пасьля памёршага бацькі караля Пятра, ляжыць хворы ў Парыжы. Да яго выздараўленьня і прысягі будзе упраўляць рада міністраў.

— „Таймс“ паведамляе што пагроза амэрыканцаў не даваць помачы галодным расейцам у выпадку нязгоды камуністаў на зьмешаныя кантрольныя камісіі мела свой вынік—Ліцьвінаў згадзіўся.

— Паведамляюць, што бальшавіцкі таргові камісар на гэтых днях едучы у Лёндан, праездам будзе ў Варшаве, дзе пастараецца завязаць гандлёвыя зносіны паміж Польшчай і Расеяй.

— У паветах Рыбніцкім і Пшчынскім немцы вядуць моцную агітацыю проці палякоў.

— У хуткім часе адбудзецца ў Празе-Чэшскай конфэрэнцыя беларускіх палітычных і грамадзянскіх дзеячоў. Удзел у працы конфэрэнцыі прымуць дэлегацыі з Амэрыкі і жыдоўскія дэлегацыі з Беларусі.

— Урад Румыніі пастанавіў забараніць прыезд расейскіх уцекачоў у межы Бесарабіі.

— У Рыгу гэтымі днямі прыехаў літоўскі міністар закардонных спраў Пурыцкіс, дзеля паразуменьня з міністрам закардонных спраў Лацьвіі.

— Палітычная паліцыя Вільні арыштавала і інтэрнавала з Вільні балахоўцаў, паміж імі і брата Балаховіча Язэпа; усіх адправілі ў Варшаву на распараджэньне міністэрства ўнутраных спраў.

Нядзеля, 21 *жніўня*.

— „Чыкаго Трыб‘юн“ падае цікавыя весткі аб апошніх днях парыскага паседжаньня Найвышэйшае Рады ў справе Верхняй Сьлезіі. Ангельскія дэлегаты далі зразумець Францыі, што калі яна ня згодзіцца на іх прапазыцыю, аддаць амаль што ня ўсю В. Сьлезію немцам, то яна згубіць падтрыманьне Англіі. Брыян хацеў было згадзіцца, але прадстаўнікі вякікай прамысловасьці паведамілі аб гэтым прэзыдэнта Мільерана, які забараніў Брыяну згаджацца з прапазыцыяй Лёйд-Джорджа, што вельмі апошняга разазлавала. Дзякуючы пасрэдніцтву італьянскага прэм‘ера спрэчкі былі вырашаны кампрамісова—перадачай пытаньня аб Верхняй Сьлезіі ў Лігу Нацыяў.

— „Berliner Tageblat“ паведамляе, што бэрлінскія палітычныя колы за тое, каб урэшце паразумецца з палякамі па гаспадарчых пытаньнях.

— Правадыр Ірляндзкага паўстаньня, паведаміў сяброў „Dail Direanu“—парлямэнт Ірляндыі, што адповедзь на прапазыцыю Англіі будзе сакрэтна абгаварабацца на тайным паседжаньні, і што воля народу вымагае поўнай вольнасьці і незалежнасьці. Ядыная ўлада павінна знаходзіцца ў руках ірляндзкага народу, ці так званых сінфэйнэраў. Лічачы, што прапазыцыі Англіі несправядлівыя, але каб ня было крыві, габінэт сінфэйнэраў будзе далей весьці перагаворы з ангельскім урадам.

Панядзелак, 22 *жніўня*.

— Лёйд-Джордж паведаміў парлямэнт аб тым, што ім зроблены ўсе захады, каб вырашыць справу Ірляндыі, але калі яна ня ўдасца, то ён войдзе ў парлямэнт з адпаведнымі проектамі.

— „Голос Россіи“ паведамляе, што паміж групамі ангельскіх, нямецкіх, ды амэрыканскіх прамыслоўцаў абгавараваецца справа адбудовы Петраграду.

— „Русспресс“ паведамляе, што польскі пасол у Маскве вядзе перагаворы з патрыярхам Ціханам аб незалежнасьці праваслаўнай царквы ў Польшчы і калі перагаворы не дадуць пэўных вінікаў, палякі будуць старацца, каб праваслаўныя цэрквы залежалі ад Канстантынопальскага патрыярхату; залежнасьць ад Масквы не пажадана для палякоў.

— З пэўных крыніц паведамляюць, што Найвышэйшая Рада пастанавіла зноў выслаць войска на В. Сьлезію. Будзе паслана: 2 бат. ангельцаў, 2—італьянцаў і адна брыгада французаў.

— Ліга Народаў пачне разьбіраць справу В. Сьлезіі 3 верасьня г. г.

— Распачалася праца зьмешанай пагранічнай расейска-украінска-беларускай і польскай камісіі для разрашэньня розных конфліктаў, якія будуць мець месца на граніцы. Усіх камісіяў тры: полацка-віленская ў Полацку, палеская і менска-несьвіжаская ў Менску.

Аўторак, 23 *жніўня*.

— „Пат“ паведамляе, што Эстонскі ўрад зьвярнуўся да Лігі Народаў з просьбаю аб прыняцьці яе ў склад сяброў Лігі.

— Умова аб помачы галодным у Расеі, нарэшце, падпісана прадстаўнікамі Амэрыкі і прадстаўніком Расеі—Ліцьвінавым. Першы транспорт мэдыцынскай помачы выедзе праз дзесяць дзён. Саветы прынялі ўсе варункі, выстаўленыя Амэрыкай.

— „Petit Parisien“ паведамляе, што грэцкі ўрад адтрымаў паведамленьне ад ураду Англіі, што ў выпадку заняцьця Канстантынопалю грэцкія войскі будуць лічыцца непрыяцельскімі.

— Гандлёвая дэлегацыя Саветаў Расеі ў Лёндане паведаміла, што Беларусь можа даць другім цровінцыям 48 тысяч тон бульбы і 8 тыс. тон збожжа.

— Як паведамляюць з пэўных крыніц справай В. Сьлезіі пры Лізе Нацыяў займецца вядомы профэс. Ашкеназі, але дзеля таго, што справа вельмі важная, дык туды павінен паехаць сам п. міністар Скірмунт.

Серада, 24 *жніўня*.

— П. П. С. на мітынгу, зробленым у нядзелю вынесла гэткую рэзалюцыю: мітынг, зроблены П. П. С. Літвы і Беларусі (глядзі і такія ёсьць. Рэд.) протэстуець проці рэзалюцыяў, зробленых павятовымі сэймікамі ад 15 жніўня, якія не выяўляюць волі ўсіх жыхароў краю, і жадаець як найхутчэйшага скліканьня поўнапраўнага Сойму, сабранага з цэлай тэрыторыі так званай Сярэдняй Літвы.

— У Савецкую Расею выехала 200 чалавек дактароў з Нямеччыны. Савецкія ўлады стараюцца ўсімі сіламі затрымаць у Расеі людзей з

обрые даюць, ісьці ня хоча, а карыстацца чужым абром, дык ласы. Кабы ты меў алей у галаве, працаваў, як усе іншые людзі, дык-бы мы і ў Костуся втулькі не напазычаліся! А цяпер раптам захацелася адаваць маё пальто! Хэ, бачыш яго!

ВАСІЛЬ. Ах, якая ты подлая, Ядзька!... Дык слухай-жа: сягоньня (*апранаецца*) вось зараз-жа іду да мужа Паўлінкі і бяру гэту праклятую службу! Усё зраблю, чаго ты хацела, за што мяне штодня як тупая піла, пілавала. Душу чорту, калі захочаш, аддам, але годзі ўжо гэтых вечных закідаў, гэтага бязупыннага пілаваньня нейкай службай. Вось-жа йду, буду рабіць, як ты хацела, але тады ўжо—годзі! маўчы!

ЯДЗЬКА. І добра зробіш. Як будзеш сыты, дык і лепей будзе пісацца гэтая твая драма.

ВАСІЛЬ. Не! Драма ўжо ніколі ня будзе напісана, нічога ўжо з гэтага ня будзе, калі й ты мяне яшчэ грызеш, дык прападзі ўсё! Усё ў печ, усё! ўсё!! (*кідае свае рукапісы ў печ і падпальвае*). Хай усё гарыць, хай усё прападае, як прападае маё жыцьце!... Усё далоў! Цяпер я буду сыты, працавіты чалавек — і добры муж. (*Няпрытомна*). о-во! Гарыць ужо! гарыць! Во—бачыш? гэта твая работа!—гарыць! Ах подлая ты! што ты нарабіла!

ЯДЗЬКА. Во—яшчэ чаго! Няўжо-ж гэта я я зрабіла? Ты-ж сам кінуў усё ў печ, я табе не казала.

ВАСІЛЬ. (*глядзіць са сьлязімі ў вачох на вагонь*). О, Божа мой! што я зрабіў! што я зрабіў! (*хапаецца за галаву і плача*).

Заслона.

АКТ III.

Зьява 1.

На сцэне сядзіць **Костусь** *і акомпаньюе сабе на гітары. Каля яго спакаваные ягоные рэчы. Ён пяе:*

Ня чўрайся, дзяўчынка, галубка, мяне,
Пажалей, прыгалуб бедака-сірату.
Збудзі сэрца, збудзі, хай навек не засьне,
Дабудзь песьню з душы, разгані цемнату.

Ня было мне пацех ад людзей, ад жыцьця,
Не заглянула сонца у хату маю, —
Віхры гналі-гулі без канца, бяз пуцьця,
Ажно долю паганую кляў я сваю.*)

Нехта стукае ў дзьверы.

КОСТУСЬ. Калі ласка.

Зьява 2.

КОСТУСЬ і БАГДЗЕВІЧ (*уваходзіць*).

БАГДЗЕВІЧ. Добры дзень, паночку!
КОСТУСЬ. Добры дзень!
БАГДЗЕВІЧ. Што-ж гэта вы з чамаданчыкам? Можа едзеце да сябе на вёску?
КОСТУСЬ. Не. Перабіраюся на новую кватэру. Чакаю толькі, каб нехта прышоў, бо няма як зрабіць з ключом... А можа хутка й на вёску паеду. Нуда нейкая села на сэрца.
БАГДЗЕВІЧ. Нуда? Багатыя людзі, каторые маюць гэтакі збытак у жыцьці, як нуда. Мы людзі бедные, мы гэтакіх роскашаў ня ведаем.
КОСТУСЬ. Людзі, каторых увесь ядыны скарб толькі нуда, можа бяднейшые за вас.
БАГДЗЕВІЧ. Быць можа... быць можа... І гэта праўда. Не зашмат багацьця. калі засталася адна толькі нуда... (*Зьмяніўшы тон*). Калі, панок, паедзеце да сябе ў маёнтак, дык скажэце мне, калі ласка... Добра?
КОСТУСЬ. А, вы можа хацелі-б паглядзець гэтые паперы?
БАГДЗЕВІЧ. Але, але. Калі пазволіце, дык паедзем разам. Для вас гэтые пацеры глупства, старое непатрэбнае сьмяцьцё, страва для пацукоў, а для нас гэта мае вялікую вартасьць, для нас гэта можа скарб! Шаснаццаты век! гм! гм!.. Апрача таго мы думаем наладзіць там блізка вас беларускую школу. Калі-б вы захацелі—маглі-б нам у гэтай справе памагчы.
КОСТУСЬ. Пане Багдзевіч! Вы-ж добра ведаеце, што я да гэтай работы нядзатны.
БАГДЗЕВІЧ. Ашукваеце самі сябе, пане Костусь! Калі-б вы толькі захацелі, шмат-бы маглі зрабіць карыснай работы.

(Працяг будзе).

*) Словы Я. Купалы.

вышэйшай асьветай, а галоўным чынам дактароў.

— Ходзяць весткі, што бальшавікі расстралялі ў Архангельску гэнэралаў: Клембоўскага і Гутара, а разам з імі яшчэ 45 афіцэраў.

— У Скутары быў вялікі пажар, які зьнішчыў каля 1000 дамоў, многа было і чалавечых ахвяр.

— У Коўне пачала выходзіць на польскай мове газэта „Dziennik Kowieński".

Чацьвер 25 жніўня.

— Гэн. Жэлігоўскі паведаміў польскага міністра заграгічных справаў, што яго абавязкі, ўзятыя на час трываньня конфэрэнцыі паміж Польшчаю і Літвою, вычарпаны. У сваім паведамленьні гэн. Жэлігоўскі прызнае ненормальнасьць датычасовага палажэньня краю, як з пагляду палітычных, так і гаспадарчых.

— Паводлуг вестак з Коўна, Літва не адмовіцца ад Вільні. Калі-б Польшча выступіла збройна, дык яна спаткалася-б з адпорам ня толькі Літвы, але і Лацьвіі. Літоўскі міністар заграгічных справаў Пурыцкіс ня верыць у збройнае выступленьне Польшчы, бо яна, ў такім разе, баялася-б нападу з боку Савецкае Расеі.

— Прэзыдэнт Ірляндыі дэ-Валера заявіў у парлямэнце, што барацьба за незалежнасьць Ірляндыі павінна вясьціся да апошняй сілы.

— Пазнанскія чугункі бастуюць, апрача лініі Грудзёндз-Дзялдово-Хэлмжа. У кірунку паўднёвым забастоўка дасягнула Лодзі.

— Палажэньне расейскіх галадоў у сэнсе апалу можа стаць катастрофічным.

— У Плоцку памерла закладчыца марыявіцкай сэкты Казлоўская.

З ПРЭСЫ.

Паведамляючы аб конфэрэнцыі, якая адбылася 19 г. мес. ў міністра ўнутраных справаў Польшчы, „Robotnik" піша:

„Мы саўсім згодны з п. міністрам Рачкевічам і з п. дыр. Урбановічам, што будучыя адносіны крэсовага насяленьня да польскага гаспадарства залежаць ад нас саміх, г. зн. ад таго, як да гэтага насяленьня будзе адносіцца польскае грамадзянства. Але філёнтропічная падмога, аб якой гаворыць п. мін. Рачкевіч, грае тут досіць невялікую ролю. Хай урад вядзе на крэсах палітыку разумную, сапраўды дэмократычную палітыку, хай перш за ўсё скароціць сваволю крэсовых зуброў і - адміністрацыйных князькоў, што прасьледуюць беларусаў і украінцаў, хай шчыра і энэргічна возьмецца за выпаўненьне соймавага закону аб аграрнай (земляльнай) рэформе і можам быць спакойнымі, што крэсовае насяленьне будзе лёяльным у адносінах да Рэчыпаспалітай"...

О, мы разумеем! Дэмократычная палітыка — рэч добрая. Сваволя зуброў і адміністрацыйных князькоў („Robotnik" мусіць ня ведае, што гэта адны й тыя самыя людзі) — рэч недэмократычная і... непалітычная.

Аграрная рэформа?.. Але што аб гэтым. Ці не аб колёнізацыі крэсаў думаюць панове пэ-пэ-эсы з „Robotnika"?

Мы ведаем, што й палітыка благая й зубры благія, й рэформа—ня новая пад сонцам.

Цікава, што-ж рабіў, каб палепшыць справу, „соцыялісты" Дашынскі, будучы віцэ-прэм'ерам?

* * *

Выходзячая ў Амэрыцы газэта „Рускій Голос" у артыкуле „Опустошённая Белоруссія" піша:

„Цяпер ужо вайны няма. Замоўклі гарматы, землі перадзелены. Але новая граніца якраз праходзіць па жывым целе Беларусі, разрэзаваючы яе на дзьве часьці: Савецкую Беларусь і Польскую". Бачачы ў першай часьці, поруч з няшчасьцямі, ўсё-ж такі шмат і добрага, ў відзе працы па адраджэньню, стацьця пераходзіць да другое часьці гаворачы:

„Там Улада растраўляе старыя раны і наносіць новыя. Школы закрываюцца, выкладаньне на роднай мове выганяецца вучыцялі заарыштоўваюцца. Дапамога, прысланая з Амэрыкі да галадаючых беларусаў не даходзіць, а разьдзяляецца між сытымі чыноўнікамі..."

?

У панядзелак, 22 гэтага жніўня, выйшаў першы нумар газэты „Родная Страха". Газэта выдана ў беларускай мове, але зьместам сваім вельмі напамінае выданьні, робленыя летась у Менску „Стражай Крэсовай", як напр., „Зорка", якую выдаваў нейкі Ваяводзкі.

Пад загалоўкам значыцца: „Беларуская вясковая тыднёвая газэта"

Не гарадзкая, а вясковая?!

Хаця рэдакцыя падае свой адрэс: „Вільня"... і г. д.

Значыць—газэта не вясковая.

Невядома напэўна--ці беларуская яна?

Жыцьцё провінцыі.

Вёс. Еглімонцы.

У тутэйшага селяніна М-ча сабралася мусіць з мільён марак, вот ён і задумаў купіць ад двара Яшуны 4 валокі зямлі. Але сяляне радзяць яму ня купляць той зямлі, бо можа надзяляць будуць, дык яна дарма прыдзецца. Хочацца яму зямліцы, але і шкада з грашмі растацца, так што бедны М-ч ад думак усох чыста, чакаючы тэй „зямельнай рэформы".

Чакай, кума, Пятра—сыр зьясі!..

Вёска Навасёлкі.

Да тутэйшай, ужо не маладой, дзяўчыны прыехалі сваты, але яна ім адмовіла за тое, што жаніх быў „просты" (гаварыў пабеларуску). Вясковыя сяляне кажуць ей: „чакала ты, дзяўчынка, гэтых простых сватоў 25 гадоў,—пачакай яшчэ столькі,—мо' часам крывыя трапяцца"!

Я. М.

Звальненьне беларускіх вучыцялёў.

Школьны інспэктар Вялейскага павету звольніў беларускіх вучыцеляк З. Івашкевіч з школы ў вёс. Марозькі Лебедзепскае валасьці і В. Маяйку з школы ў в. Запаляжі Лебедзеўскае валасьці. Абедзьве вучыцялкі звольнены як „невыкваліфікованыя". Вучыцялкі гэтыя скончылі 7 клясаў гімназіі. З польскіх школ вучыцялёў з гэткай і меншай адукацыяй ня толькі не звальняюць але і назначаюць.

Ці-ж гэта справядлівыя адносіны да беларускае школы?

ГОРАДЗЕН.

Вобыскі і арышт.

Па распараджэньню Павятовага Старасты пачаліся обыскі ў беларускіх працаўнікоў.

Зроблены обыскі ў старшыні Горадзенскага Белар. Камітэту С. Баранава і ў старшыні Грамады Белар. моладзі У. Курбскага, які заарыштованы.

Ўсе беларускія працаўнікі пераходзяць на нелегальнае становішча.

Асвабаджэньне п.п. Дубяйкоўскага і Дзякуць-Малея.

Заарыштованы і вывезены палякамі у Беласток, Старшыня Беларускага Камітэту ў Варшаве Л. Дубяйкоўскі, выпушчаны на волю і выехаў ў Варшаву.

Заарыштованы польскаю ўладаю Старшыня Беларускай Школьнай Рады Л. Дзякуць-Малей—выпушчаны на волю.

Н.

Беларуская хроніка.

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ СХОД.

У аўторак 23 г. жніўня ў салі 1-й Віленскай Бел. Гімназіі адбыўся першы, арганізацыйны сход „Т-ва Беларускае Школы". Пасьля прачытаньня статуту пастаноўлена пераняць ад Беларускае Школьнае Рады ўсе справы, выбрана частка Управы Т-ва і на гэтым першы сход зачыніўся.

Чародны сход Т-ва ў нядзелю 4 верасьня а 5 г. ўдзень у салі Бел. Гімназіі (Вострабрамская, 9).

На вучыцельскіх курсах.

Дзеля таго, што ўжо вельмі недалёка да пачатку вучэбнага году, лекцыі на беларускіх вучыцельскіх курсах на гэтым тыдні саўсім скончаны і курсы падходзяць да поўнага іх зачыненьня.

НОВЫЯ КНІЖКІ.

Вышлі з друку гэткія кніжкі пабеларуску:

„Niadzielašnija Ewanheli i nawuki" кс. Д-р Ільдэнфонса Бобіча. Выданьне „Крыніцы".

„Беларуская правапісь з практыкаваньнямі" Янкі Станкевіча. Выданьне „Беларускага Выдавецкага Т-ва".

Сцэнічны твор Л. Родзевіча „Зьбянтэжаны Саўка"—жарт у 1 дзеі. Выданьне У. Знамяроўскага.

Ігнат Абдзіраловіч „Адвечным Шляхам".

Вышла з літаграфіі карта паўкулі з назовамі пабеларуску.

Рэзалюцыя Беларускага Вучыцельства.

I. Прымаючы пад увагу катастрофічнае палажэньне асьветы сярод беларускага народу і тое, што вядзецца сыстэматычная арганізаваная работа, каб адабраць у беларускага народу яго нацыянальную школу і гэтым давясьці яго да духоўнае і эканамічнае галіты і сьмерці і што адным з спосабаў дасяганьня гэтае мэты зьяўляецца перацягаваньне беларускіх вучыцялёў у чужыя школы, Рада Беларускага Вучыцельскага Саюзу пастанаўляе: дамагацца ад усіх беларускіх вучыцялёў і наагул ад усіх беларусаў, каб яны працавалі толькі ў беларускіх школах. Хто не паслухае, лічыць таго здраднікам профэсыянальным, сялянства і ўсяго беларускага народу.

II. Разгледзіўшы пытаньне аб пасыланьні ў пачатку школьнага году беларускіх вучыцялёў на курсы ў Кракаў і Варшаву, і знайшоўшы, што высыланьне беларускіх вучыцялёў з пачатку школьнага году на курсы ў Польшчу носіць чыста палітычны характар і мае на мэце пакінуць беларускі народ без сваіх вучыцялёў, а значыцца і бяз школ Рада Беларускага Вучыцельскага Саюзу забараняе вучыцялём ехаць на гэныя курсы ў Польшчу, ссылаючыся на мотывы і прасьцярогу, якія прыняты ў пункце І.

ТУТЭЙШАЕ ЖЫЦЬЦЁ.

Закрыцьце газэты.

18 гэтага месяца на моцы пастановы Тымчасовай Урадовай Камісіі ад 17 г. мес. і распараджэньня Дырэктара Дэпартамэнту Унутраных Справаў закрыта штодзенная газэта «Dzwon Litwy».

Апраўданьне рэдакцыі «Głosu Litwy».

23 гэтага жніўня Акружны Суд у Вільні разьбіраў справу літоўскіх грамадзян — сяброў Рэдакцыйна-Выдавецкага Камітэту «Głosu Litwy» — п. п. Андрэя Рандаманскага і Віктара Бурэйшы, абвінавачаных па 128, 129 і 534 ст. ст. Карнага Кодэксу, за надрукаваньне ў вышэйсказанай газэце артыкулаў у кастрычніку і лістападзе мінулага году. Бараніў абвінавачаных п. Т. Урублеўскі.

На моцы дэкрэту аб амністыі з 28 чэрвеня г. г. (арт. 6 пункт. А) Суд пастанавіў справу зьліквідаваць і пастанову аб спыненьні часопісі за 20 сьнежня мінулага году адмяніць.

У Літоўскай Гімназіі.

24 г. месяца Дырэктар Літоўскай Віленскай Гімназіі п. М. Біржышка адтрымаў паперу з Дэпартамэнту Адбудовы, Гандлю і Прамысловасьці аб тым, каб у працягу тыдня (да 1 верасьня) гімназія выселілася з памяшканьня, якое дасюль яна займае з 1918 г. па Міцкевічавай вул. ў доме № 38. Гімназія заложена ў 1915 г. і лічыць 450 вучняў і вучаніц. У чэрвені і ліпні г. году у будынку гімназіі, яе ўласным коштам быў зроблены рэмонт на суму 3 мільёнаў марак. Гімназія не адтрымоўвае ніякіх дапамог ад мясцовых уладаў і істнуе пераважна на ахвяры амэрыканскіх літоўцаў.

Вулічнае здарэньне.

Гэтымі днямі на Віленскай вул. сталася гэткае здарэньне з сябром управы Жыдоўскае Гміны грамадзянінам Крукам. Калі грам. Крук, ідучы дамоў, недалёка ад Міцкевічавай вул. абмінаў нейкага жаўнера, які йшоў з дамаю, дык жаўнер гэты штурхануў Крука лакцём, кажучы: „Ці табе мала месца?" У часе спрэчкі жаўнер ударыў грам. Крука па твары. Калі грам. Крук зьвярнуўся да паліцэйскага, той заявіў, што ня можа пакінуць пост. Тады грам. Крук пайшоў да 3 вокругу паліцыі, дзе аб выпадку быў напісаны пратакол. Жаўнер пайшоў сабе далей.

Беларускі тэатр.

У суботу, 20 г. жніўня, ў доме профэсыянальных саюзаў (Акадэміцкая, 4) была пастаўлена п'еса Ф. Аляхновіча „Дрыгва". Сюжэт гэтае п'есы ня новы. „Дрыгва"—пераробленая на 6 абразоў 4-х актовая п'еса «Манька», таго самага аўтора. Пастаноўка нязвычайна ўдалася.

На другім месцы па мастацкай гульні сваёй заслужвае быць пастаўленым побач з аўторам вышкалены артыст Шчансновіч, які нязвычайна ярка спаўніў ролю Лякдугны ў вусны якога і ўложана аўторам самае слова „дрыгва". Зусім п'янае палажэньне Лякдугны на сцэне — вельмі ня ўдзячнае для артыста ў даным ходзе п'есы, аднак гэткі, як п. Шчансновіч, старанны артыст, даказаў з якой лёгкасьцяй можна выйсьці з труднага палажэньня, ня даўшы навет ні маленечкага цяню шаржу.

Вялікую артыстычную здольнасьць выказала ў ролі „Манькі" пані С.; калі-б яна лёгка перамагла ўсё труднасьці (для яе) нашае мовы, дык была-б саўсім на высаце заданьня.

Рэшта артыстаў старалася быць на месцы.

Застаецца толькі пажадаць, каб нашыя спэктаклі бывалі шмат часьцей.

Знаёмы.

Заўтра, 27 жніўня, ў салі Белар. Муз.-Драм. Гуртка (Біскупская 2) адбудзецца концэрт Беларускага хору Згірскага і будуць пастаўлены тры камічны аднаактоўкі.

Паштовая скрынка.

Чарняўскаму. Сухаволя. Грошы адтрымалі. Дзякуем. Часопісь высылаем. Пішэце што ў Вас чуваць.

Майору Р-ву. Журнал і ахвяру адтрымалі. Дзякуем. Пішэце да нас. Нажаль, ня можам споўніць Вашу просьбу каб зьмясьціць абвестку.

Костусю. Рыга. Пісьмо Ваша на імя С—на адтрымалі. „Наша Думка" закрыта. Што просіце пастараемся выслаць. Пішэце, што ў Вас чуваць.

Ґрамадзяне, спауняйце сваю павіннасьць, запісуйцеся ў „Т-ва Беларускае школы"!

Друкарня „Віленскага Выдавецтва" Б. А. Клецкіна.

Рэдактар-Выдавец ФРАНЦІШК АЛЯХНОВІЧ.